ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 188 (1155) | СУБОТА, 16-га жніўня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Нарада сэкратароў райкомаў адкладзена

Замест нарады скліканецца на 28 жніўня пленум ЦК ЛКСМБ разам з сэкратарамі райкомаў.

Аб колькасьці дадзеных кожнай акрузе на пленуме месц будзе паведамлена асобна

Бюро ЦК ЛКСМБ.

УЧОРА АДЧЫНІЎСЯ ПЯТЫ КОНГРЭС ПРОФІНТЭРНУ

З усіх канцоў сьвету сьцягваюцца аддане́йшыя змагары за пролетарскую дыктатуру, за канчатковую перамогу соцыялізму

10 год профінтэрну—10 год барацьбы за ленінскую лінію ў міжнародным профруху

Пролетарская моладзь—ударны атрад рэволюцыйнага руху

Конгрэс штабу рэволюцыйнага руху

15 жніўня адкрыўся у Маскве сусьветны кангрэс Чырвонага Інтэрнацыяналу Профсаюзаў. Сьледам за ім зьбяруцца на міжнародныя конфэрэнцыі прадстаўнікі рабочых краін Лацінскай Амэрыкі, нэграў, арабаў і розных галін прамысловасьці.

Увесь пролетарскі сьвет, усе тыя, хто стогне пад цяжарам жорсткай капіталістычнай эксплёатацыі, усе тыя, хто ня можа мірыцца з сыстэмай капіталістычнага нявольніцтва, усе тыя, у кім жыве дух змаганьня супроць імпэрыялізму, будуць з напружанай увагай сачыць за работамі V-га сусьветнага конгрэсу Профінтэрну і міжнародных конфэрэнцый.

У адзнаку ад нядаўна скончанага ў Стакгольме кангрэсу Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу, гэтага зборышча наскрозь прагніўшых, адарваных ад рабочых мас прадстаўнікоў, зросшых з апаратам буржуазнае дзяржавы і прадпрыемчых аб'яднаньняў прафсаюзаў, на V-ым конгрэсе Профінтэрну і міжнародных вытворчых канфэрэнцыях будуць прымаць удзел актывістыя-рэволюцыянэры, загартаваныя ў клясавых бойках, якія прайшлі турмы і праследваньні, якія прасякнуты агнём рашучасьці да барацьбы і веры ў канчатковую перамогу рабочае справы.

Стокгольмскі конгрэс Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу ўвойдзе ў гісторыю сусьветнага профэсыянальнага руху, як конгрэс адкрытай клясавай здрады і організаванага міжнароднага штрэйкбрэхерства, як кангрэс падрыхтоўкі рэфэрмісцкімі правадырамі рабочае клясы да ўспрыняцьця новай імпэрыялістычнай вайны і да задушэньня першага ў сьвеце пралетарскага краю—СССР.

Стакгольм і Масква—гэта два варожыя канцавосьсі, паміж імі непраходная бяздоньне.

На V-м конгрэсе Профінтэрну зьбяруцца ў пераважнай большасьці пралетары ад варштату, якія раскажуць простай, натуральнай мовай, як жыве і змагаецца пролетарыят за рубяжом, у краінах капіталу, у калёніях і паўкалёніях. Гэтыя пралетары-рэволюцыянэры, прыбыўшыя ў Москву, перамагаючы непамерныя цяжкасьці паліцэйскай рагаткі, раскажуць усяму сьвету аб тым, як з дня ў дзень імпэрыялістыя праактыўным удзеле і непасрэднай садзейнасьці рэформісцкіх кіраўнікоў профсаюзаў падрыхтоўваюць новую сусьветную вайну, як яны разам са зьлейшымі ворагамі Савецкага Саюзу рыхтуюцца нанясьці сьмяротны ўдар сацыялістычнаму будаўніцтву ў краіне Саветаў.

V-ты сусьветны кангрэс Профінтэрну і міжнародныя вытворчыя канфэрэнцыі абмяркуюць пытаньне аб тым, як у абстаноўцы ўзрастаючага сусьветнага крызісу і беспрацоўя мобілізаваць масы на барацьбу і абарону іх штодзённых патрэб супроць капіталістычнай рацыяналізацыі, супроць політыкі клясавага міру і супрацоўніцтва з буржуазіяй, супроць міру ў прамысловасьці і „гаспадарчай дэмократыі", супроць політыкі клясавай здрады.

На падставе накопленай за апошнія гады багатай рэволюцыйнай практыкі яны распрацуюць далейшую тактыку ў эканамічных сутычках, абмяркуюць пытаньне аб тым, як пераводзіць гэтыя сутычкі на рэйкі баявых політычных выступленьняў, пераключаць іх на барацьбу за ўладу. Яны абмяняюцца вопытам барацьбы ў асобных краінах, каб гэты вопыт інтэрнацыяналізаваць.

Яны выкрыюць пажом сьмелай рэволюцыйнай крытыкі і самакрытыкі ўсе дапушчаныя ў мінулых баёх памылкі, слабасьці і недахопы. Пытаньні аб мэтадах бязьлітаснага перамаганьня праваопортуністычных тэндэнцый і „левага" сэктанцтва ў сусьветным рэволюцыйным прафруху, аб лепшай організацыі мас перад тварам надыходзячых рашучых клясавых баёў, выкарчоўваньні ўсіх недахопаў і ўпушчэньняў, аб выхаваньні новых кіруючых кадраў, выхаваньні сярэдняга і нізавога профактыву будуць стаяць у цэнтры ўвагі кангрэсу і конфэрэнцый.

Роля савецкіх профсаюзаў у будаўніцтве ў СССР, прыстасаваньне да гэтай соцыялістычнай будоўлі ўсяго сусьветнага пролетарыяту, найшырэйшая популярызацыя пяцігодкі пляну вялікіх работ за рубяжом—усё гэта таксама будзе прадметам абмеркаваньня і пастаноў конгрэсу і конфэрэнцый.

Нарэшце, будуць займаць значнае месца ў пастановах гэтых міжнародных рэвалюцыйных організацый пытаньні актыўнай дапамогі змагаючымся атрадам Кітаю, Індыі, каленіяльных і паўкалёніяльных краін.

V-ты сусьветны конгрэс Профінтэрну—агляд сіл і ўплыву міжнароднага рэволюцыйнага профруху — магутны вагар для мобілізацыі мас да надыходзячых клясавых баёў.

Рабочыя Савецкага Саюзу павінны з максымальным інтарэсам і ўвагай сачыць за ходам конгрэсу і конфэрэнцый і панесьці іх пастановы ў масы далучыць шырокія пласты пролетарыяту да міжнароднага профэсыянальнага руху.

Не павінна быць ніводнага рабочага, які ня ведаў-бы аб гэтых пастановах. Аўладаць увагай рабочых нашай краіны, перадаць зарубежным атрадам пролетарыяту практыку, набытую намі за гады рэволюцыйнай барацьбы супроць самаўладзтва і капіталістых, за гады грамадзянскай вайны і ў гады бурнага ўздыму соцыялістычнага будаўніцтва, перакінуць мост ад савецкага рабочага, які самаахвярна будуе соцыялізм да таго, хто змагаецца супроць капіталістычнага прыгнечаньня і імпэрыялізму зарубежнага пролетарыяту, разгарнуць шырокае інтэрнацыянальнае выхаваньне мас,—вось практычныя задачы рэволюцыйнае рабочае клясы ўсіх краін у сувязі з конгрэсам Профінтэрну.

Конгрэс Профінтэрну пройдзе пад знакам самакрытыкі і дзеяньня

Гутарка прадстаўніка ТАСС з генэральным сакратаром Прафінтэрну т. Лазоўскім

Конгрэс адкрываецца ў вельмі складаны пераломны момант. У сусьветнай эканоміцы і політыцы нарастаюць падзеі, якія ў бліжэйшы час паставяць Комінтэрн, Профінтэрн і іх сэкцыі перад сур'ёзнымі баявымі задачамі.

Эканамічны крызіс нарастае з нястрымнай сілай, новыя мільёны беспрацоўных выкінуты з капіталістычных прадпрыемстваў; змаганьне за рынкі прымае ўсё больш востры характар, узброеньні растуць; у асноўных калёніях (Індыя, Кітай) узьдымаецца новая магутная рэвалюцыйная хваля, рабочая кляса капіталістычных краёў пераходзіць у контр-наступленьне, у найбольш слабых зьвеньнях капіталістычнага арганізму (Румынія, Польшча) эканамічны крызіс перарастае ў політычны — увесь сьвет дрыжыць у сваіх асновах. І ў гэты-ж самы час, наперакор усім прароцтвам, СССР нясутрымна ідзе наперад. У такой абстаноўцы конгрэс Профінтэрну будзе займацца падцягваньнем суб'ектыўнага фактару да ўзроўню спрыяючай об'ектыўнай абстаноўкі.

Амстэрдамцы, якія сабраліся ў ліпені гэтага году, умудрыліся прайсьці міма эканамічнага крызісу, беспрацоўя, ліхаманкавага ўзброеньня, колёніяльных рэволюцый і небясьпекі вайны. Прыказчыкі капіталу, якія сабраліся ў Стакгольме, не змаглі абмяркоўваць гэтых пытаньняў, бо капіталістычная сапраўднасьць зусім не падобна на іхны „арганізаваны капіталізм". Разьвіцьцё крызісу супярэчыць усім іх прагнозам і абяцаньням. Ім не было чаго маўчаць. І зьезд Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу прайшоў галоўнага, сконцэнтраваўшы сваю ўвагу на пытаньні аб .. месцазнаходжаньні гэтага Інтэрнацыяналу.

Мы—не амстэрдамцы, і на надыходзячым конгрэсе скажам і выявім усё так, як яно ёсьць. У нас ня будзе імпэрыялістычных супярэчнасьцяй, якія так выразна выявіліся ў нетрах Амстэрдаму, і мы ня будзем займацца „месьніцтвам".

Мы будзем на нашым конгрэсе змагацца за правільную політыку ў масавым руху, за тактыку адзінага фронту зьнізу, за лепшыя способы і мэтады заваяваньня большасьці рабочае клясы, за самастойнае кіраўніцтва эканамічнымі баямі.

Усе пытаньні, якія цікавяць дэлегатаў будуць абмяркоўвацца адкрыта. Мы не хварэем амстэрдамскім самаздавальненьнем і абмежаванасьцю і таму мы будзем сурова крытыкаваць дзейнасьць сэкцый Профінтэрну. Мы разгледзім забастоўку за забастоўкай, кампанію за кампаніяй і бяз страху выкрыем нашыя слабасьці і нашыя язвы. Для таго ж конгрэс і зьбіраецца каб падагуліць вынікі мінулага, даць ацэнку сучаснаму і намеціць мэтады і способы змаганьня для будучага. Калі гэта ня прынята ў Амстэрдамскім Інтэрнацыянале—тым горш для яго.

Наш конгрэс ня будзе зьвязаны з Лігай Нацый і яе міжнародным бюро. Таму мы скажам усё, што думаем аб небясьпецы вайны, аб спробах акружэньня СССР. Наш конгрэс ня будзе займацца гульнёй у „хаванкі" і скажа усё, што ён думае аб „рабочых" урадах і іх штрэйкбрэхэрстве ў справе зрыву эканамічнага і палітычнага змаганьня пролетарыяту.

Конгрэс Профінтэрну не падобны па сваім складзе на Амстэрдамскі конгрэс. Там толькі частка Эўропы, у нас—усе кантынэнты, усе краіны, усе расы. Ужо зараз прыехалі дэлегаты з Аўстраліі, Кітаю, Японіі, Філіпін, Корэі, Інда-Кітаю, Індыі, Эгіпту, Англіі, Злучаных Штатаў, Бразіліі, Уругваю, Парагваю, Чылі, Пэру, Эквадору, Мэксыкі, Гватэмалы, Гандурасу, Сальвадору, Кубы, Новай Зэляндыі, Паўднёвай Афрыкі, Камэруну, Гамбіі і г. д. Дадайце дэлегатаў з усіх краёў Эўропы і вы ўбачыце, што справа ідзе аб сапраўдным інтэрнацыянале, а не аб эўрапэйскім трэсьце для абароны капіталізму ад рэволюцыі, яка насоўваецца.

Для кожнага дэлегата, з якога-б куту ён ні прыехаў, ясна, што рабочая кляса ідзе насустрач жорсткім клясавым баям і пад гэтым пунктам погляду мы будзем разглядаць і абмяркоўваць усе пытаньні.

У масы шляхам адзінага фронту зьнізу, змаганьне супроць правага опортунізму і левага сэктанцтва, сапраўднае кіраўніцтва масавымі эканомічнымі боямі пролетарыяту цесная сувязь коленіяльных навольнікаў з рабочымі капіталістычных краёў і з пролетарыятам СССР—такія задачы V конгрэсу Профінтэрну.

Практыка дзесяцігадовай работы і змаганьня служыць гарантыяй таго, што V конгрэс Профінтэрну выканае гэтыя задачы і стане сур'ёзнай вехай на шляху заваяваньня большасьці рабочае клясы для зьнішчэньня капіталізму і ўстанаўленьня дыктатуры пролетарыяту.

„СССР—зьяўляецца самым буйным рынкам у сьвеце"

„Бяспрэчна, экономічная програма Савецкага Саюзу,—гаворыць Кемпбелл,—будзе пасьпяхова выканана"

НЬЮ-ЁРК, 14. Буйны амэрыканскі фэрмэр Томас Кемпбелл, які зьвярнуўся нядаўна з Савецкага Саюзу, праз друк зварачваецца да амэрыканскіх дзяльцоў, прапануючы ім скарыстаць савецкі імпорт для перамогі эканомічнага крызісу. Калі ПАЗШ ня зробіць гэтага,—піша ён,—дык гэта зробяць іншыя краіны

Кемпбел констатуе, што Савецкі Саюз зьяўляецца самым буйным рынкам у сьвеце для амэрыканскіх тавараў.

Гаворачы аб перавыкананьні пляну індустрыялізацыі і колектывізацыі у СССР, Кемпбелл заяўляе, што „бяспрэчна, экономічная програма Савецкага Союзу будзе пасьпяхова выканана".

Індыя ў полымі рэволюцыйных паўстаньняў

Паўстанцы занялі эўропэйскі квартал Пешавара

Ангельскія імпэрыялістыя скінулі звыш 8000 бомб

40.000 паўстанцаў супроць англа-брытанскай улады

Лёндан, 14.—Паўстаньне ў паўночна-заходняй провінцыі Індыі ахапіла ўсе плямёны ў раёне Сура на захад ад Пешавару.

У чыннасьці супроць англа-брытанскай улады ўдзельнічае каля 40.000 паўстанцаў. Да племені афрыдыяў далучылася племя урангзаяў.

За ўчарайшы дзень ангельскія аэропляны скінулі звыш 8.000 бомб, не зрабіўшы гэтым ніякай шкоды паўстанцам.

Плямёны афрыдыяў занялі эўропэйскі квартал Пешавара

Лёндан, 14.—Згодна паведамленьняў з Індыі, учора раніцою атрад паўстанцкага племені афрыдыяў пранік у эўропэйскі квартал Пешавара і адкрыў ружэйны агонь па дамох, якія заняты чужаземцамі.

Атрад прабыў у горадзе звыш 2-х гадзін і пасьля напружанай перастрэлкі з войскамі і паліцыяй пакінуў яго. Ідзе энэргічнае перакіданьне ўрадавых войск у раён Пешавара.

Паўстаўшыя плямёны вядуць наступ

Лёндан, 14.—Афрыдыі і іншыя паўстаўшыя плямёны вядуць наступленьне на шэраг гарадоў і перарэзалі чыгунку каля важнага ў стратэгічных адносінах чыгуначнага мосту праз рэчку Інд, якая злучае станіцы паўночна-заходняй провінцыі з астатнімі провінцыямі Індыі.

Расавыя „сутычкі"

Лёндан, 13.—Па паведамленьню з Бомбэю ў раёне Сукура ня спыняюцца расавыя „сутычкі" на рэлігійнай глебе, якія прымаюць характар узброеных баёў. 20 вёсак амаль зусім зьнішчаны. У Сукурскую акругу паслана войска „для падаўленьня інда-мусульманскай разьні".

Пяцігадовы аэро-плян

Вайсковае міністэрства ПАЗШ распрацоўвае грандыёзны пяцігадовы плян будаўніцтва вайсковага паветранага флёту. (З газэт).

Акцыі падаюць... а аэропляны падымаюцца.

Францыя

Забастоўка 150 тысяч

ПАРЫЖ, 14. Забастоўка пратэсту супроць закону аб соцыяльным страхаваньні на поўначы Францыі, якой ахоплена 150 тысяч рабочых, працягваецца па ўсёй вобласьці з ранейшай напружанасьцю.

Нарада па пытаньню правядзеньня колгасна-вытворчага паходу комсамолу

17 жніўня а 2 гадзіне дню ЦК ЛКСМБ і рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" склікае нараду па пытаньню правядзеньня колгасна-вытворчага паходу комсамолу.

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі ад НКЗБ, Колгасцэнтру, Малжывёлаводсаюзу, Белсельтрэсту, Сьвінатрэсту, Паляводсаюзу, Дасьледчага сельска-гаспадарчага інстытуту імя Леніна, ЦСПСБ, ЦП саюзу сельгаслесрабочых, Наркамасьветы, сэкратары і старшыні РБДКА і РК ЛКСМБ г. Менску.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні ЦК ЛКСМБ. Просьба памянёных організацыі даслаць сваіх прадстаўнікоў.

ЦК ЛКСМБ і рэдакцыя „Чырвонай Зьмены".

БУДЗЕМ УДАРНІКАМІ ПА ЗБОРУ ПРАПАНОЎ І ВЫНАХОДЗТВАЎ

Кожны працоўны павінен унесьці сваю долю ў фонд IX-га зьезду УсеЛКСМ і X зьезду ЛКСМБ

Усесаюзны збор прапаноў і вынаходзтваў паскорыць індустрыялізацыю краіны

Выкарыстаць усе магчымасьці для хутчэйшай індустрыялізацыі краіны

Цэнтральныя газэты, паказваючы вопыт працы заводу **Дзяржынскага** (Днепрапятроўск), прапануюць **арганізаваць усесаюзны збор прапаноў і вынаходзтваў.**

„Комсамольская Праўда“ прапануе стварыць фонд імя IX зьезду УсеЛКСМ, заклікае увесь комсамольскі друк пачаць збор прапаноў і вынаходзтваў.

Адказваючы на збор прапаноў мы пачынаем друкаваньнем прапановы дэлегатаў 1-й Усебеларускай нарады комсамолу па транспанту, якія павінны палепшыць падрыхтоўчую працу чыгункі да асеньня-зімовых перавозак. Сёньнешнія прапановы, гэта—першы рэйд комсамолу Беларусі па збору практычных прапаноў.

Прымаючы выклік „Комсамольской Праўды“ аб арганізацыі збору прапаноў і вынаходзтваў рэдакцыя зьвяртаецца да комсамольскіх арганізацый БССР з просьбай прысылаць практычныя прапановы па палепшаньню працы заводаў, фабрык, колгасаў і г. д. у фонд IX-га зьезду УсеЛКСМ і X зьезду ЛКСМБ.

Прапановы і вынаходзтвы паскорාць індустрыялізацыю нашай краіны, а таму комсамольскім арганізацыям неабходна практычна, па прыкладу дэлегатаў 1-й Усебеларускай нарады па транспарту, прыступіць да працы. Чакаем матар‘ялу.

Арганізаваць опэрацыйныя штабы

Я лічу неабходным зараз-жа мобілізаваць комсамольскую арганізацыю чыгункі, асабліва групы „Лёгкай Кавалерыі“ на справу лепшай падрыхтоўкі дарогі да асеньня-зімовых перавозак.

„Лёгкія Кавалерыстыя“ павінны па прыкладу Віцебску арганізаваць налёты на склады, пакгаузы, дэпо, мясцкомы, станцыі, таварныя двары і г. д., каб праверыць іх падрыхтаванасьць да перавозак.

Пры пакгаузах, плацформах, саставах і г. д. арганізаваць опэрацыйныя штабы, якія павінны мець цесную сувязь з гаспадарнікамі, комсамольскай ячэйкай які і інформаваць аб становішчы даручанага штабу вучастку. Штабы пры пагрозе зрыву працы на іх вучастку, павінны паведаміць комсамольскі колектыў, гаспадарнікаў і патрабаваць неадкладнага рэагаваньня на гэтыя зьявішчы.

Несьцераў.

Абменьвацца вопытам

Першае,—дабіцца, каб у кожную паравозную ці цягніковую брыгаду быў вылучан адзін прыкладны комсамолец, які быў-бы штурхачом сьледваньня цягнікоў згодна раскладу.

Другое,—больш абменьвацца вопытам дасягненьняў паміж колектывамі вузлоў.

Трэцяе,—арганізаваць штабы па сувязі чыгуначнай комсамольскай арганізацыі з гарадзкой.

Р. Б.

Наладзіць вучот

1. Зараз на **Віцебскім** вузьле справа з запаснымі часткамі абстаіць вельмі дрэнна. Па весткам некаторых таварышоў, у разгары асеньня-зімовых перавозак мы можам стаць перад фактам недахопаў запасных частак, а таму я прапаную праверыць шляхам налёту склады МЧ, ці гатовы яны да асеньня-зімовых перавозак у сэнсе забясьпечаньня матар‘яламі і запаснымі паравознымі часткамі.

2. У нас у Віцебску, асабліва па плянава-папераджайнаму рамонту, дрэнна пастаўлены вучот. Неабходна весьці суровы вучот выкананьня рамонту згодна паказчыкаў, бо невядома, якая брыгада не спраўляецца з сваімі задачьнямі, шляхам-жа наладжваньня вучоту мы зможам выявіць, хто ня выконвае паказчыкаў.

Г. І.

Перайсьці на 2 зьмены. Выкарыстаць легкавыя машыны

Саюзтранс не пасьпявае выгружаць грузаў з таварных складаў, а таму загружанасьць некаторых станцый пагражае заторамі для будучых перавозак. **Я прапаную перавесьці працу Саюзтрансу на дзьве зьмены.**

Мы нядаўна чыталі ў газэце „**Рабочий**“, **што больш 50 проц. памідораў** было сапсавана з-за таго, што іх вазілі на фурманках. Я думаю, што для грузаў, якія хутка псуюцца, можна выкарыстоўваць легкавыя аўтамабілі, якія ў некаторых установах днём бязьдзейнічаюць.

Абрамовіч

Узяць шэфства над Саюзтрансам

Улічваючы тое, што Саюзтранс кепска падрыхтаван да асеньня-зімовых перавозак, комсамолу неабходна прыняць шэфства над працай гэтай установы. Неабходна, узяўшы шэфства над Саюзтрансам, праверыць як падрыхтована гэта ўстанова да асеньня-зімовых перавозак. Акрамя гэтага я лічу, што нашаму друку неабходна зьвярнуць большую увагу на працу чыгункі. **„Чырвонай Зьмене“ неабходна выпускаць старонку чы уначнікаў, дзе-б усе вузлы БССР маглі абменьвацца вопытам, а не варыцца ў сваім саку.**

Капцюкоў.

Здачу паравозаў пад цягнікі ўскласьці на дэпо

Дзякуючы недахопу паравозных брыгад у пэрыяд асеньня-зімовых перавозак па-мойму мэтазгодна было-б падрыхтоўку да здачы паравозаў пад цягнікі ўскласьці на дэпо, чым скароцім лішнюю трату часу паравозным брыгадам. Гэтым мерапрыемствам мы зможам павялічыць кілёмэтровы прабег паравозных брыгад.

Д. Ч.

Арганізаваць брыгады для выгрузкі вагонаў

У **Магілёве** на шоўкавай фабрыцы прастойваюць шмат вагонаў з-за таго, што яны несвоечасова выгружаюцца. Комсамольскаму колектыву шоўкавай фабрыкі неабходна арганізаваць брыгады, якія-б дапамагалі выгружаць вагоны.

Выправіць паваротны круг пры дэпо ст. Магілёў.

Янкоўскі

Ворша выклікае Віцебск

Па пастанове бюро колектыву ЛКСМБ вузла **Ворша** выклікаем на соцспаборніцтва Віцебскі чыгуначны колектыў комсамолу на лепшае правядзеньне асеньня-зімовых перавозак. Выклікаем спаборнічаць па наступных пытаньнях:

1. Арганізаваць ударныя комсамольскія і маладзёжныя брыгады па рамонту паравозаў.
2. Арганізаваць пасты, якія-б сачылі са своечасовым выхадам паравозаў з пад набору вугалю і своечасова выходзілі з рамонту.
3. Стварыць ударныя комсамольскія паравозныя і кандуктарскія брыгады, якія-б сваёй прыкладнасьцю дабіваліся своечасовага сьледваньня цягнікоў згодна раскладу.
4. Стварыць ударныя брыгады з комсамольцаў і моладзі, якія-б у выпадку затору дапамагалі выгружаць і разгружаць эшалёны.
5. Мобілізаваць беспрацоўных комсамольцаў на будаўнічую працу, каб своечасова закончыць пабудову неабходных памяшканьняў для асеньня-зімовых перавозак.
6. Шляхам суботнікаў забясьпечыць будаўніцтва рабочай сілай.
7. Шырака разгарнуць працу груп „Л. К.“ на своечасовае папярэджаньне гаспадарча-адміністрацыйнай арганізацыі аб становішчы вузла.

Галкоўскі.

Стварыць комсамольскія камітэты чыгуначнікаў

Зараз, як усім ужо вядома, комсамольцы-чыгуначнікі працуюць дрэнна. Працуюць дрэнна таму, што іх работай не кіруюць. Райкомы больш увагі зьвяртаюць на працу гарадзкіх ячэек комсамолу і аб чыгуначных ячэйках чамусьці забыліся. Так, напрыклад, у нас у Жлобіне, Райком комсамолу нават ня ведае, ці існуе комсамольскі колектыў чыгуначнікаў.

Я лічу, што было-б мэтазгодна арганізаваць спэцыяльныя комсамольскія камітэты чыгуначнікаў, якія-б непасрэдна кіравалі толькі чыгуначнымі ячэйкамі.

Гэта палепшыць кіраўніцтва і саму працу чыгуначнай арганізацыі.

ЦК ЛКСМБ павінна часьцей склікаць нарады па пытаньню чыгункі.

Фінкельштэйн.

Наладзіць кантроль над курсамі

Кожны дзень на вузлах арганізуюцца курсы па падрыхтоўцы кваліфікаванай сілы для чыгункі. Адзін толькі Аршанскі вузел арганізаваў 9 курсаў па розных спэцыяльнасьцях. Ад працы гэтых курсаў залежыць падрыхтаванасьць рабочых да працы. А таму мы прапануем шляхам арганізацыі пастоў, сачыць за працай гэтых курсаў і неадкладна рэагаваць праз належачыя ўстановы і арганізацыі на ўсе хворыя бакі іх працы.

Стварыць брыгады ў дапамогу коопэрацыі для кантрактацыі гародніны і сачыць за выкананьнем гэтай працы.

Мобілізаваць комсамольскую і піонэрскую арганізацыю па збору тары.

Аршанская дэлегацыя

Для палепшаньня працы чыгункі я прапаную:

1. Стварыць пры колектывах вузлавыя комсамольскія штабы па асеньня-зімовым перавозкам.
2. Разьбіць ячэйку на групы, прымацоўваючы кожную групу да цэху, пакгаузу і амбару, каб яны сачылі за працай.
3. У месцы, дзе створацца пробкі, заторы, вялікія цяжкасьці па пагрузцы і разгрузцы вагонаў, складаў—кінуць комсамольцаў.
4. „Чырвонай Зьмене“ шырока асьвятляць гэтую працу, дзеля чаго арганізаваць куток альбо старонку.

Зялёнка

Усім таварышом, якія вылучаны ФКК (б)Б і ЛКСМБ у якасьці політкантроляў „лекпомаў“ (консультантаў), у „аптэку“, лазарэт“, „губу“, „казэмат“ для правядзеньня політмасавага кругаву роту, ФРК К(б)Б і ЛКСМБ прапануе зьявіцца роўна а 6-й гадзіне 17-га жніўня на спортпляцоўку саду „Профінтэрна“ для атрыманьня адпаведных інструкцый ад тав. Харкова.

ФРК КП(б)Б і ЛКСМБ.

7-ы рэйд „чырвоназьменаўскіх“ брыгад

Бяспрытульнае зьвяно

Вырваць сады з ціскоў драпежніцтва і безгаспадарнасьці

Нарыхтоўка садовіны ва ўмовах БССР набывае выключна важнае значэньне, бо Беларусь зьяўляецца адным з галоўнейшых пунктаў, адкуль вывозіцца садовіна ў іншыя месцы Савецкага Саюзу і за межы.

Згодна пляну Менскага аддзяленьня Белсаюзплодгародніны, сёлета павінна быць нарыхтавана ня менш 4400 тон яблык, прычым з гэтай колькасьці 1000 тон высокагатунковых яблык будзе экспартавана за межы і значная частка накіравана ў Ленінград і на Урал.

Пляны нарыхтовак і экспорту садовіны, параўнаўча з мінулым годам, павялічылася больш, чым на 100 проц што накладае асаблівую адказнасьць на ўсе загатоўчыя арганізацыі за поўнае і своечасовае выкананьне плянаў

БАЛЯНС БЕЗГАСПАДАРНАСЬЦІ

Але сапраўднае становішча з нарыхтоўкай садовіны дае нам далёка ня радасны малюнак, пагражаючы невыкананьнем плянаў.

Праведзенае па савгасах Белсельтрэсту і іншых гаспадарчых арганізацый абсьледваньне садоў, выявіла абураючыя адносіны гэтых арганізацый да садовых гаспадарак.

Вось, прыкладна, што піша агент Белсаюзплодгародніны, які рабіў абсьледваньне садоў па савгасах Самахвалавіцкага раёну:

„Сады савгасаў знаходзяцца ў абураюча безгаспадарчым становішчы.



Уборка гародніны ў колгасе „Пролетары“—Узьдзенскі р-н.

Пладовыя дрэвы стаяць без падпорак і пад цяжарам пладоў ламаюцца. Вартаўнікоў у садох няма. Садовіна раскрадаецца. Склады для хаваньня садовіны не пабудаваны. Рэалізатараў садовіны няма. Савгасы не даюць рабочай сілы для збору раньніх гатункаў з-за гэтага яблыкі гінуць“.

Малюнак безгаспадарнасьці па садох Самахвалавіцкага раёну, на вялікі жаль, характэрны і для іншых раёнаў.

У Койданаўскім раёне 15 гэктараў саду вартуе толькі адзін чалавек, тады як патрэбна ня менш 3—4.

У садзе савгасу Вязынь-Фаніпаль ляжаць два вагоны сьпелых яблык. Яблыкі гінуць, бо кіраўнік савгасу, спасылаючыся на ўборачную кампанію, адмаўляецца даць неабходную рабочую сілу для ўпакоўкі іх і адгрузкі.

У садзе савгасу Воўчкавічы,—адным з самых буйных у Менскай акрузе, дзякуючы безгаспадарнасьці кіраўніцтва савгасу, раскраданьне садовіны за апошні час прыняло грандыёзныя разьмеры. За мінулы тыдзень па самых мінімальных падліках раскрадзена больш 500 пудоў яблык.

ВЫНІКІ ДРАПЕЖНІЦКАЙ „ПОЛІТЫКІ“

У кіраўнікоў савгасаў шырока распаўсюджана шкодная тэндэнцыя—не займацца садовай гаспадаркаю, сады здаваць у арэнду і гэтым самым пазбавіць сябе ад лішніх клапот. У выніку гэтай „політыкі“, якая практыкавалася савгасамі на працягу ўсіх мінулых год, арэндатары, драпежніцкімі адносінамі да садоў, ператварылі каштоўныя высокагатунковыя сады ў жудасныя могілкі пладовых дрэў. Сады страшэнна запушчаны, з абламанымі галінкамі, амаль на палову зьменшылі ўраджай садовіны. Утвораная сёлета новая арганізацыя — Белсаюзплодагародніна—прапанавала савгасам спыніць драпежніцкае зьнішчэньне народнага багацьця, адмовіцца ад здачы садоў у арэнду і ўласнымі сродкамі даглядаць і апрацоўваць сады. Але тыя неабходнейшыя для захоўван… садоў мерапрыемствы некаторымі … гасамі дагэтуль яшчэ ня выкан… Так, напрыклад, савгасы Пухавіц… раёну і сёлета здалі сады ў арэ…

СПЫНІЦЬ ЗАГАТОЎЧУЮ „ЧАХАРДУ“

Паміж загатоўчымі арганізац… ўмоўлена, каб нарыхтоўку садо… правесьці наступным чынам: Бел… саюз павінен рабіць нарыхтоўкі … ключна па колгасным сэктары. … коопсаюз сыстэмаю сваёй коопэра… цыйнай сеткі нарыхтоўвае па інд… дуальным сэктары, а савгасы зьяў… юцца як-бы рэзервам, дзе загат… непасрэдна Белсаюзплодгародніна. … гэта разьмеркаваньне функцый з… парушаецца паасобнымі загатоўч… арганізацыямі. Напрыклад, Пуха… райпаляводсаюз, ня маючы на … ніякага права, заарэндаваў … савгасаў Белсельтрэсту. … хавіцкі РВК, замест таго, каб заба… ніць Райпаляводсаюзу незакон… чыннасьць, вынес абураючую га… цяпскую пастанову, у якой адоб… дзеяньні Райпаляводсаюзу і забар… Белсаюзплодгародніне рабіць н… тоўкі садовіны ў Пухавіцкім р… Галавацяпы з РВК нават дайшл… таго, што прапанавалі ня пушчаць … загатоўцаў Саюзплодгародніны ў … ён. Райпаляводсаюз, маючы па… маньне „зьверху“, заняўся цкаван… нем агентаў усіх іншых загато… арганізацый, катэгорычна адмо… даваць Саюзплодгародніне статыс… ныя весткі аб нарыхтоўцы гаро… ўпарта адмаўляецца адказваць н… пісьмовыя запытаньні Белсаюз… гародніны.

ЭКОНОМІЯ НАВЫВАРАТ

Белсаюзплодгародніна таксам… пусьціла цэлы шэраг памылак у … рыхтоўках. Асабліва гэта выявіл… назначэньні цэн на ягады і сад… Напрыклад, пры загатоўках яга… купальныя цэны былі вызнача… столькі нізкія, што нельга было … товіць нават нязначнай коль… ягад. У выніку гэтай „экономіі“ … саюзплодгародніны, заводы М… якія займаюцца перапрацоўкай … засталіся без сыравіны і МЦРК … мушаны быў на сваю рызыку з … кім спазьненьнем пачаць загат… ягад уласнымі сродкамі па на… чайна высокіх цэнах.

СКАРАЦІЦЬ АПЭТЫТЫ БЕЛ… СЕЛЬТРЭСТУ

Між іншым, павышэньню цэн … довіну і гародніну садзейнічалі … гаспадарчыя арганізацыі. Бел… трэст, паклаўшы пад сукно дыр… ву партыі аб барацьбе за павы… не рэальнае зарплаты рабочага, … віў перад Белсаюзплодгаро… пытаньне аб павышэньні цэн … лыкі, тады як сёлетнія цэны … на ўсю садавіну і так значна … вышаюць леташнія.

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН НАРЫХТО… ВАК ЭКСПОРТУ

Такое становішча плюс вост… дахоп тары пагражае сарваць… ніе пляны нарыхтовак садові… экспорту. Неабходна тэрміновае … шаньне органаў прокуратуры і … арганізацый, каб прызваць да … некаторых зарваўшыхся загато… тых, хто ім у гэтым дапамагае … на заўсёды трэба палажыць ка… загатоўчай чахардзе. Плян нары… садовіны і экспорт яе за мяжу … нен быць выканан поўнасьцю.

Н. М…

Паход камсамолу за сьвінагадоўлю

„Для сьвіней няма часу“

Так заяўляюць кіраўнікі Стара-Дароскага райжывёлаводсаюзу і сэкратар Сьмілавіцкага РК КСМ, прыкрываючыся шыльдаю ўборачнай кампаніі і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы

Пастановы партыі і рашэньні ЦК ЛКСМБ не даведзены да шырокіх мас комсамольцаў

Камітэты і ячэйкі, разгортвайце масавы паход за сьвінагадоўлю, рапартуйце ЦК і „Чырвонай Зьмене“ аб праробленай працы

Не затрымліваць водпуску прамтавараў здатчыкам сьвінаматак

Пастанова Эканамічнай нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР аб комплектаваньні сьвінаматкамі сьвінаводчых колгасаў і савгасаў да гэтага часу ня выканана.

Згодна гэтай настановы ўкомплектаваньне сьвінаводчых колгасаў і савгасаў павінна праводзіцца за лік сьвінаматак, якія маюцца ў саміх гаспадарках, адбору з адкормачных пунктаў бэконнай контрактацыі сьвінак вясеньняга апаросу.

Па сыстэме малжывёлкоопэрацыі дана заданьне: закантрактаваць сьвінак вясеньняга паросу 52,200 штук, (законтрактована каля 4 724), закупіць 32000 шт. (закуплена на 1-VIII —631 сьвінка) і закантрактаваць ад вясновага апаросу 10 00 матак (закантрактавана—2723) Згодна пастановы СНК, з адкормачных пунктаў Белмалжывёлсаюзу павінна быць адабрана 1000 дарослых матак і 1200 парасят (сьвінак) для продажу іх сьвінаводчым колгасам. але да гэтага часу з месц няма ніякіх зьвестак аб колькасьці адабраных матак і аб перадачы іх колгасам.

Ня глездзячы на шматразовыя ўказаньні Белмалжывёлсаюзу аб пашырэньні працы па ўкомплектаваньню матачным матар'ялам колгасаў аб разгортваньні кантрактацыі, закупцы матак, адборы з адкормачных пунктаў, раёны ў гэтай працы не пераключыліся яшчэ на баявыя тэмпы. Выпадкі, калі маткі і да гэтага часу ня зьняты з адкорму, перакармліваюцца, становяцца ня годнымі на племя ня рэдкі.

Наспэцыялізаваныя сьвінагадоўчыя колгасы ня ахоплены кантрактацыяй сьвінак вясновага апаросу. Аб індывідуальным сэктары працаўнікі сыстэмы жывёлагадоўчай коопэрацыі зусім забыліся.

У гэту працу ня ўцягнуты малжывёлтаварыствы масы пайнікаў малочнажывёлагадоўчай коопэрацыі. А між тым яны-б аказалі вялікую дапамогу ў гэтай справе. Прыкладам у Старобінскім раёне 400 пайнікаў малочнай коопэрацыі пастанавілі, каб кожны пайнік здаў адну сьвінку матку для ўкомплектаваньня сьвінагадоўчых колгасаў, але галавацяпы з спажыўкаапэрацыі да гэтага часу тармозяць водпуск прэміяльных прам. тавараў здатчыкам сьвінаматак. Наогул трэба сказаць, што пытаньне організацыі буйных соцыялістычных фабрык мяса раённымі організацыямі слаба праведзена ў масы. Ня створана грамадзкай думка, якая-б мобілізавала масы на правядзеньне гэтага важнейшага мерапрыемства партыі і ўраду. Замест жывой, практычнай працы ў раённых організацыях, назіраецца грызьня, недагаворанасьці, бюрократычная перапіска. Узяць для прыкладаў Копыльскі раён Менскай акругі і Стара-Дароскі р-н Бабруйскай акругі. Да гэтага часу наглядаюцца злачынныя адносіны спажыўкоопэрацыі да стварэньня прэміяльных фондаў. да гэтага часу прамтавары ня вылучаны і імі Малочнажывёлагадоўчая сыстэма не забясьпечана, ня глездзячы на пастанову НКГандлю.

Пры такім становішчы надалей справа ўкомплектаваньня сьвінаматкамі прамыслова-сьвінагадоўчых колгасаў будзе сарвана.

Шапавалаў.

Злачынствы ня спыняюцца

Сьвінаматкам усё яшчэ пагражае нож

Будаўніцтва і організацыя матачнага стада савгасаў праводзіцца ў надзвычайна цяжкіх умовах з-за недастачы будматар'ялаў, адсутнасьці кваліфікаванай рабочай сілы і вопыту працы ў сьвінагадоўлі, якая праводзіцца ў такім буйным маштабе. Гэтыя цяжкасьці яшчэ ўскладняюцца тым, што мясцовыя організацыі акруг і раёнаў усё яшчэ не ўсьвядомілі усёй важнасьці задач, якія стаяць перад імі.

Кантроль рабочых мас слабы, грамадзкасьць не мобілізавана. Комсамол яшчэ ня ўсюды прышоў у баявую гатоўнасьць, не мобілізаваў сваіх шэрагаў на вырашэньне гэтай задачы.

Між тым на фронце сьвінабудаўніцтва становішча далёка нездавальняючае; аб гэтым гавораць факты, выкрытыя камісіяй, якая правярала адкормачныя пункты спажывецкай сыстэмы і ўкомплектаваньне стада сьвінагадоўчых савгасаў.

Коопэрацыя да гэтага часу надбайна вядзе будаўніцтва. Гомельскі „ЦРК „ухітрыўся“ пабудаваць адкормачны пункт на месцы, дзе амаль немагчыма дастаць добраякаснай вады. Улажыўшы больш 100 рублёў на галаву, ЦРК пабудаваў так, што дажджавая вада і бруд ідзе ў сьвінарнік, а ня з сьвінарніку.

На адкормачных пунктах ЦРК у Гомелі, Бабруйску, Магілёве адкармліваюцца тысячы сьвінаматак, частка з іх ужо няпрыгодна для разводу, рэшта знаходзіцца пад пагрозай зьнішчэньня—убою на мяса

Мала гэтага Гомельскі і Бабруйскі ЦРК ухітрыліся забіваць сьвінаматак на мяса адмаўляючыся выконваць пастановы СНК БССР аб здачы сьвінаматак сьвінаводчым гаспадаркам

На сельскіх пунктах спажывецкай коопэрацыі сьвінаматак заганяюць у цёмныя хлявы, у бруд, не даючы выганаў і нават зялёнага корму, губяць матар'ял, псуюць стады, якія павінны даць мяса.

Мясцовыя гарадзкія саветы, раённыя выканаўчыя камітэты ня толькі не дапамагаюць організацыі сьвінаводчых саўгасаў, а тармозяць справу забараняюць вываз матак з сваіх раёнаў і акруг без усялякіх на гэта падстаў.

Белмяса, заклíканае комплектаваць стада „Сьвінаводу“ у акругах ня глездзячы на тое, што з моманту падпісаньня договару прайшоў месяц, пасылае матак сваёй кантрактацыі на адкормачныя пункты, а не „Сьвінаводу“.

Будаўніцтва ў савгасах часта зрываецца з-за адсутнасьці рабочай сілы, таксама і чума з якою не вядзецца належнай барацьбы. Чума пасіляецца з-за невуцтвая і галавацяпства на мясцох, робіць вялікія прарывы на сьвінаводчым фронце.

Кожная комсамольская ячэйка і к-т павінен мобілізаваць шырокія колы моладзі выпрацаваць баявую програму сваіх дзеяньняў і ў ур'ёз рушыць у паход за сьвінагадоўлю.

Н. Гарыменка

На здымку: пародзістыя сьвіна-маткі ў комуне „Зьвязда“—Астрашыцка-Гарадзецкага раёну.

„Пачнём пасьля ўборачнай кампаніі

У Стара-Дароскім раёне (Бабруйшчына) не праводзіцца ніякай падрыхтоўчай працы да будаўніцтва сьвінарнікаў і сілосных ям.

Нарыхтоўка будаўнічых лесаматар'ялаў праходзіць марудна. З адпушчаных 400 кубамэтраў большая частка яшчэ стаіць на пні і па думцы кіраўніцтва Раймалжывёлсаюзу, лес будзе нарыхтован і дастаўлен на месцы пабудоў «толькі пасьля ўборачнай кампаніі, калі будзе ў нас час для гэтай работы».

У раёне ёсьць выпадкі сьвінной чумы, але ніякіх мер барацьбы з ёю не праводзіцца. Ня будуюцца карантыны, ізолятары.

З вызначаных для жывёлагадоўлі 6-ці колгасаў толькі адзін прыступіў да пабудовы сьвінарніка. Але будаўніцтва праходзіць зусім марудна, бо няма належнага тэхнічнага догляду.

Да апошняга часу ў Раймалжывёлсаюзе няма планаў і сталых лічбаў па ўкомплектаваньню сьвінаводчых колгасаў сьвінаматкамі. Амаль зусім не праводзіцца праца па кантрактацыі сьвінаматак. Накіраваныя ў раён два загатоўцы бязьдзейнічаюць і не даюць ніякіх вестак аб выкананьні плянаў кантрактацыі.

Ня лепш справа і з сілосаваньнем. З намечаных да будаўніцтва 16 ям пачалі будаваць 8, але ніхто за працай не наглядае. Колгасы, якім адпушчаны крэдыты на сілоснае будаўніцтва, чамусьці адмаўляюцца іх атрымаць.

Райком комсамолу і комсамольскія ячэйкі зусім не займаюцца пытаньнямі жывёлагадоўлі і сілосаваньня. Пастанова ЦК ЛКСМБ аб задачах комсамольскай організацыі і ўдзеле комсамольскіх мас у вырашэньні задач сьвінагадоўлі і сілосаваньня не даведзены да шырокіх комсамольскіх мас.

Сябры „ЛК“—**С. М., С. Л., М. Т**

„Ня ваша справа“

У колгасе імя 16-ці партызан (Сьмілавіцкі раён) да разьвіцьця сьвінагадоўлі адносяцца надбайна. 7 сьвінаматак і 10 парасят колгас трымае ў надзвычайна брудным памяшканьні, цэлымі днямі ня корміць.

Вылучаныя колгасам людзі для догляду не адчуваюць сябе адказнымі за даручаную справу.

Комсамольская ячэйка Дукоры, якая знаходзіцца побач з колгасам, не зьвяртае на гэта ніякай увагі. Старшыня колгасу, калі сяляне робяць яму заўвагі аб недапушчальных адносінах да сьвінагадоўлі, адказвае: „Гэта ня ваша справа, я сам усё ведаю“. Цікава, чаму старшыня колгасу 16-ці партызан, ведаючы пра беспарадкі, ня прымае мер, каб наладзіць справу.

Цм Л ві і.

Саромяцца займацца сьвінагадоўляй

Рагачэўская ячэйка комсамолу ня прымае ніякага ўдзелу ў разьвіцьці сьвінагадоўлі па колгасах і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках. Ячэйка да гэтага часу не прапрацавала з комсамольцамі і моладзьдзю пытаньняў разьвіцьця сьвінагадоўлі і пастановы ЦК аб задачах комсамолу ў гэтай галіне.

У ячэйцы нават неяк саромяцца займацца сьвіннымі пытаньнямі.

Колгас „Полымя“, які знаходзіцца пад бокам ячэйкі, ня глездзячы на ўсе спрыяючыя ўмовы, справай разьвіцьця сьвінадоўлі не займаецца.

Сілосаваньне зусім не праводзіцца. Комсамолец, які скончыў курсы па сілоснаму будаўніцтку, не бярэцца за працу. «Зараз гарачая пара ўборкі ўраджаю і займацца трохі будаўніцтвам будзем увосень»,—кажа ён.

Заслаўскаму райкому комсамолу трэба ліквідаваць прарывы Рагачэўскай ячэйкі.

Чубар.

На 1-ым політэхнічным зьезьдзе

Роля ФЗС ў падрыхтоўцы прамысловых кадраў

(Даклад ВСНГ СССР)

Даклад аб ролі ФЗС у падрыхтоўцы прамысловых кадраў і задачах гаспадарчых органаў зрабіў прадстаўнік ВСНГ СССР тав. Панкратаў.

Адзіная політэхнічная культура, абавязковая для ўсіх кадраў, павінна пранізваць усе зьвеньні асьветных шляхоў у падрыхтоўцы гэтых кадраў. Асноўным фундамантам гэтай адзінай політэхнічнай культуры зьяўляецца этап пачатковага політэхнічнага навучаньня, якое забясьпечваецца для ўсяго падрастаючага пакаленьня рабочае класы. Лепшым тыпам гэтага пачатковага навучэньня зьяўляецца фабрычна-заводзкая сямігодка (ФЗС), якая павінна разглядацца у непарыўнай сувязі з вытворчасьцю і ўсім яго соцыяльна-эканамічным акружэньнем.

І падобна таму, як прамысловасьць разглядае ў якасьці сваёй неадкладнай справы ФЗВ, яна таксама-ж павінна адносіцца і да ФЗС. Страты гаспадарчага парадку, якія непазьбежна выцякаюць ў кожным прадпрыемстве пры адсутнасьці ФЗС, як пачатковай ступені політэхнічнага абучэньня кадраў, ня могуць быць зьвернуты ні адным з чарговых зьвеньняў профэсыйнага і вытворчага абучэньня: ні фабзавучам ні профкурсамі, ні тэхнікумам. Таму затраты, укладзеныя ў ФЗС, куды рэнтабельней для прамысловасьці і ўсёй гаспадаркі ў цэлым, чым нават падвоеныя затраты дзяржавы на чарговыя зьвеньні сыстэмы падрыхтоўкі кадраў. **Такім чынам, ФЗС на бліжэйшы час зьяўляецца важнейшым зьвяном у падрыхтоўцы кадраў.**

Побач з гэтым ФЗС, зьяўляючыся школай політэхнічнай, але ня маючай мэтаю падрыхтоўку рабочай сілы павінна быць асноўнай і важнейшай базай школ ФЗВ і тэхнікумаў.

Сёлета ў ФЗВ павінна быць прынята каля 300 тысяч вучняў, а ў працягу двух бліжэйшых год—да 600 тысяч. Цяперашняя-ж сетка ФЗС ахоплівае ўсяго толькі 150 тысяч чалавек. Таму неабходна прыняць меры да таго, каб выжыць гэта адставаньне сеткі ФЗС ад патрабаваньня і тэмпу разьвіцьця ФЗВ.

Тав. Панкратаў паведаміў, што ВСНГ СССР прызнаў будаўніцтва ФЗС неадкладнай гаспадарча-політычнай задачай прамысловасьці, абавязаў дырэктараў прадпрыемстваў, кіраўнікоў гасп. аб'яднаньняў, трэстаў і ВСНГ разглядаць ФЗС, побач з усёй справай падрыхтоўкі кадраў, гаспадарчым абавязкам з вынікаючай адсюль адказнасьцю за невыкананьне неабходных мерапрыемстваў па разгортваньню і ўмацаваньню сеткі навучальных устаноў.

„Няма часу займацца сьвінагадоўляй“

Сьмілавіцкі райком комсамолу зусім не займаецца пытаньнямі сьвінагадоўлі. Яшчэ да гэтага часу не абгаварылі на бюро РК пастаноў ЦК ЛКСМБ аб абвешчаным паходзе комсамолу за сьвінагадоўлю, не намецілі ніякіх практычных мерапрыемстваў у працы комсамольскіх ячэек.

Сэкратар РК тав. Вольскі тлумачыць бязьдзейнасьць райкому ў галіне разьвіцьця сьвінагадоўлі тым, што цяпер „няма часу займацца сьвінагадоўляй“, бо праводзіцца ўборка ўраджаю і падрыхтоўка да асеньняй сяўбы.

Комсамольскія ячэйкі раёну ня прымаюць ніякага ўдзелу ў разьвіцьці сьвінагаспадарак. Ніводная з іх не прапрацавала пастановы ЦК ЛКСМБ і ня ўключылася ў паход комсамолу па самаправерцы выкананьня дырэктыў партыі і рашэньняў ЦК ЛКСМБ.

Р. М...ок.

Да дырэкцыі Белдзяржкіно

Адкрыты ліст

У сваёй пастанове ЦК ЛКСМБ лічыць неабходным выдаць да Х-га зьезду ЛКСМБ спэцыяльны кіно-фільм, які-б адбіваў працу ЛКСМБ.

17-га жніўня Фрунзэўская організацыя праводзіць першую політ-масоўку—„Політ-масавы кругаварот“, які ставіць сваёй мэтай больш глыбока прапрацаваць асноўныя рашэньні партыі, узьняць вышэй політычную бадзёрасьць усёй організацыі, праверыць ход падпіскі на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“ і інш.

Раённы камітэт лічыць, што гэта павінна стаць дасягненьнем усёй організацыі, а таму просіць уключыць політ-масоўку ў фільм, які будзе выдан да Х-га зьезду ЛКСМБ

Падрыхтоўка да прызыву 1908 г

Разгортвайце соцыялістычнае спаборніцтва

паміж ячэйкамі, фабрыкамі, заводамі, колгасамі, савгасамі

на лепшую падрыхтоўку да прызыву,

за ўдарніцтва прызыўнікаў,

за энэргічны ўдзел ва ўборачнай і хлебазагатоўчай кампаніях,

за 100 проц. яўку на прызыў.

„Спадзяюся, што вы абгаворыце і адкажаце“

Ліст прызыўнікам Малейкаўскага сельсавету, Брагінскага раёну

Дарагія таварышы! Праз два месяцы вы прыдзеце на зьмену чырвонаармейцам 1906 году. Я хачу з вамі падзяліцца думкамі, што вы павінны зрабіць цяпер, каб прызыў прашоў добра

Галоўная наша задача—гэта праверыць ці няма ў шэрагах прызыўнікоў чужого элементу, каб не дапусьціць яго ў Чырвоную армію. Побач з гэтым, вы павінны дапамагчы колгасьнікам і бядняцкім гаспадаркам найхутчэй правесьці ўборку ураджаю і падрыхтавацца да асеньняй пасеўнай кампаніі.

Нядаўна скончыўся XVI зьезд партыі. Вы павінны распрацаваць яго рашэньні сярод усяго насельніцтва. Яны павінны быць даведзены да кожнага калгасьніка, бедняка і серадняка, каб яны ведалі задачы, пастаўленыя партыяй перад нашымі колгаснымі гаспадаркамі ў сэнсе разьвіцьця сельскай гаспадаркі і г. д.

Гэта праробленая вамі работа зьявіцца найлепшым агітатарам прыліву бядняцкіх і серадняцкіх мас у колгасы.

Перад уходам у Чырвоную армію вы павінны заключыць дагавары па соцспаборніцтву з сваімі колгасамі і саўгасамі. Вы павінны ўзяць на сябе абавязацельствы выконваць свае задачы, якія стаяць перад кожным чырвонаармейцам, у павышэньні баяздольнасьці тэй ці іншай часьці і наогул усёй Чырвонай арміі. Колгасьнікі-ж павінны абавязацца праводзіць у жыцьцё рашэньні XVI партзьезду.

Мы-ж з Чырвонай арміі прыдзем падрыхтаванымі на вёску і задачы, усклаленыя на нас партыяй і РВС, поўнасьцю выканаем.

Спадзяюся, што мой ліст вы абгаворыце на сваёй конфэрэнцыі і адкажаце мне, што вы зрабілі.

З чырвонаармейскім прывітаньнем чырвонаармеец Н-скага Стралковага Палка Беларускай Дывізіі—**Протчанка Зах.**

Узмоцніць паліт-выхаваўчую працу

Грамадзкасьць Вузьдзеншчыны ўжо даўно пачала працу па выяўленьню і недапушчэньню клясава варожых элемэнтаў у Чырв. армію.

Прызыўнікі 1908 году абгаварваліся на сходах комсамольскіх ячэек, груп беднаты, сходах моладзі і самых прызыўнікоў.

На кожнага быў дадзен характарызуючы матар'ял аб яго мінулым і паводзінах зараз.

Аднак, зусім слаба пастаўлена палітвыхаваўчая праца сярод прызыўнікоў, якія зусім ня ўцягнуты ў існуючыя палітгурткі.

Час, які застаўся да прызыву, неабходна максымальна выкарыстаць для далейшага выяўленьня клясава варожых элемэнтаў, правядзеньня палітвыхаваўчай працы.

Прызыўнік-Заранік

Гавораць прызыўнікі Хойніцкага р-ну

(З пастановы конфэрэнцыі прызыўнікоў)

— Мы, прызыўнікі-комсамольцы заяўляем, што па закліку партыі і сав. улады ўсе як адзін, забясьпечым 100-процантную своечасовую яўку па прызыў. Абавязваемся не дапускаць адзнак рэкрутчыны (беспарадкаў, п'янства, хуліганства і г. д.).

Абавязваемся да прызыву прапрацаваць пастановы 16-га зьезду УсеКП(б) разам з комсамольскімі ячэйкамі і актыўна праводзіць іх у жыцьцё, накіраваўшы сваю энэргію на ўборачную хлебазагатоўчую кампанію, разгортваньне працы па разьвіцьцю жывёлагадоўлі, пашырэньне тэмпаў колектывізацыі, садзейнічаць недапушчэньню ў армію социяльна-чужых элемэнтаў.

Абавязваемся актыўна ўдзельнічаць у грамадзкіх організацыях ТСА-Авіяхэму, МОПР'у і інш.

Фрунзаўцы, слухайце выклік Кастрычнікаўцаў

(З пастановы конфэрэнцыі прызыўнікоў Кастрычнікаўскага раёну)

Мы, маладыя рабочыя 1908 г. нараджэньня, уступаючы ў шэрагі Чырвонай арміі, добра ведаем, што і ў шэрагах Чырвонай арміі перад намі застаюцца тыя-ж мэты і задачы, якія стаяць перад усёй рабочай клясай, гэта—барацьба за ленінскую генэральную лінію, барацьба за бальшавіцкія тэмпы будаўніцтва соцыялізму, барацьба за перамогу сусьветнай пролетарскай рэволюцыі.

Конфэрэнцыя лічыць, што кожны рабочы прызыўнік, які ўліваецца ў шэрагі Чырвонай арміі, павінен пакінуць на прадпрыемстве лепшы прыклад энтузіязму ў барацьбе за выкананьне пяцігодкі, комуністычных адносін да працы, а таксама павезьці з сабой у Чырвоную армію рапарт аб посьпехах нашай соцыялістычнай прамысловасьці і ўмяшаць у абавязак кожнага прызыўніка-рабочага за час, які застаўся яму працаваць на прадпрыемстве, правесьці наступнае:

а) Уступіць ва ўдарныя брыгады і ўцягнуць у іх усю рабочую моладзь прадпрыемства, ставячы перад сабой мэту: ліквідаваць прарывы, выканаць і перавыканаць прамфінплян за 4-ты квартал і ўвесь гаспадарчы год.

б) Актыўна ўдзельнічаць у падрыхтоўцы да 3-га году пяцігодкі шляхам абгаварэньня на рабочых сходах кантрольных лічбаў і організацыі сустрэчнага прамфінпляну.

в) Організаваць шырокую популярызацыю і вывучэньне рашэньняў 16 партзьезду шляхам асабістага актыўнага ўдзелу і ўцягненьня ўсёй рабочай моладзі ў палітгурткі.

г) Наладзіць працу па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці на прадпрыемствах.

д) Дапамагаць організацыі прызыву 1908 году шляхам популярызацыі ўсіх мерапрыемстваў, зьвязаных з ім, выяўленьня клясава-чужых і варожых элемэнтаў, якіх не дапусьціць у шэрагі Чырвонай арміі. У час прызыву зьявіцца прыкладам дысцыплінаванасьці і вытрыманасьці для ўсіх прызыўнікоў.

Беручы на сябе гэтыя абавязкі, конфэрэнцыя лічыць неабходным організаваць соцспаборніцтва па выкананьню іх паміж прызыўнікамі і прадпрыемствамі, даручыўшы РК ЛКСМБ організаваць і кіраваць гэтай справай.

Конфэрэнцыя выклікае прызыўнікоў Фрунзэўскага раёну на соцыялістычнае спаборніцтва па лепшаму выкананьню вышэйпаказаных мерапрыемстваў.

Чырвонаармейцы на прывале.

Дапамаглі ўбраць ураджай і пабудаваць сьвірань

Комсамольскай ячэйкай пры пабудове ільна-прадзільнага комбінату (Аршаншчына) узята шэфства над колгасам „Зара Свабоды“. Да комсамольскай ячэйкі далучыўся рабачком і 27-га ліпеня была паслана брыгада ў ліку 30 чалавек (з комсамольцаў і рабочай моладзі) для дапамогі ва ўборцы сена.

7-га жніўня брыгада зрабіла другі выхад для ўборкі сена і пабудовы сьвірна.

Гэтымі днямі ў колгас прыйдзе брыгада, якая дапаможа пабудаваць сілосную яму і ўбраць ураджай.

Кари.

Усім ячэйкам ЛКСМБ Фрунзэўскага раёну

17-га жніўня на спорт. пляцоўцы саду „Профінтэрн“ назначаецца паліт-масавы кругаварот па прапрацоўцы рашэньняў XVI зьезду УсеКП(б) усёй організацыі ЛКСМБ разам з беспартыйнай рабочай моладзьдзю і дарослымі рабочымі.

Раённы камітэт прапануе ўсім ячэйкам зьявіцца да клюба а 6-й гадзіне, організавана з оркестрамі да Райкому.

На паліт-кругаварот запрашаюцца ўсе рабочыя.

Пропускі атрымаць у сэкрэтароў комсамольскіх ячэек.

Пасьля кругавароту—масавыя гульні, скокі, організаваныя ТРАМ'ам ЦСПСБ і Фізкультуртэхнікумам.

Сэкратар ФРК ЛКСМБ Райхельсон.

Футбольны матч Нямеччына—Беларусь

14 жніўня ўпяршыню беларускія фізкультурныя масы спаткаліся з рабочымі фізкультурнікамі Нямеччыны на ўсебеларускім стадыёне.

Гэта спатканьне зьяўляецца яшчэ адным крокам да ўмацненьня інтэрнацыянальнай сувязі паміж пролетарскімі фізкультурнікамі Беларусі і Нямеччыны. Дзеля гэтага і матч менш за ўсё прасьледваў спартыўныя мэты.

К прыезду фізкультурнікаў Нямеччыны быў організаваны агульнагарадзкі прабег фізкультурнікаў пад лёзунгамі: „узмацненьне інтэрнацыянальнай сувязі, 100 проц. рэалізацыя пазыкі „5-годка—у 4 гады“. У прабегу ўдзельнічала 150 чалавек. З іх 50 чал. жанчын. Першае месца па часу ў прабегу заняў саюз дрэваапрацовачнікаў (мужчыны) і саюз гарбароў (жанчыны). Старт прабегу адбыўся на стадыёне, пасьля чаго пачаўся футбольны матч паміж Нямеччынай і зборнай Беларусі.

Нямецкая рабочая каманда паказала ўзор надзвычайна добрай тэхнікі і зыгранасьці. Ігракі паказалі добрую пасоўку і веданьне свайго месца. Гэта нельга сказаць наконт зборнай Беларусі, якая была складзена за два дні да прыезду нямецкіх фізкультурнікаў. Ня гледзячы на то, што ў каманду ўвашлі лепшыя ігракі Беларусі, яна адрозьнівалася сваёй нясыгранасьцю.

Матч закончыўся з вынікам у карысьць Нямеччыны.

Учора і сёньня нямецкія фізкультурнікі наведаюць фабрыкі і заводы Менску. Сёньня на стадыёне адбудзецца матч між камандамі Нямеччыны і «Дынамо».

Э. Каганская

Першы выпуск школы „Профрух“

Учора адбыўся выпуск першага набору школы „Профрух“. Выпускаецца лектарская група ў складзе 22 чалавек. На працягу ўсіх заняткаў курсанты перажылі шмат цяжкасьцяй, якія значна адбіліся на вучобе.

ЦСПСБ, які зьяўляўся організатарам нашай школы, ня цікавіўся становішчам курсаў і жыцьцём курсантаў. Прадстаўнік сэктару кадраў прышоў на курсы ў канцы заняткаў. Тав. Рыжоў прыходзіць да нас чытаць лекцыі, а тав. Калодка інструктаваў нас дзеля паездкі на перавыбары ў раёны.

Умовы заняткаў былі дрэнныя. Нас ганялі з канца ў канец па памяшканьнях. У малодшых групах не хапала падручнікаў. Інтэрнаты недастаткова абсталяваны. Патрэбных для заняткоў умоў ня было.

Але курсанты, ня гледзячы на гэтыя перашкоды, упарта працавалі над пашырэньнем свайго сьветапогляду ў галіне профэсыйнай працы. Сярод курсантаў большая частка моладзі.

Кожны курсант, які скончыў гэту школу, прышоўшы сюды ад варштату, будзе лепшым ... чом, будзе лепшай энэргіяй, зможа зрушыць працу профсаюзнага апарату далёка ўперад. ... ўступаем на профэсыйную ... ў пэрыод рэконструкцыі, у ... перабудовы ўсёй працы профсаюзаў, ... ту і мы, курсанты, атрымаўшы ... дрэнныя веды ад нашых кіраўнікоў, нашых лектароў, зможам праводзіць у жыцьцё тое, што ... чыць нам партыя і што ... віў нам XVI зьезд.

З. Г...

Да ведама

камандыраваных на гадовыя курсы комсамольскага актыву пры Комвузе Беларусі

Даводзіцца да ведама ўсіх т.т., камандыраваных на курсы комсамольскага актыву, што з 20-га жніўня будуць праводзіцца іспыты паступаючых на курсы ў наступным парадку:

1. Для паступаючых:

а) З Гомельскай і Полацкай акр. —20 жніўня, а 10 гадз. раніцы.

б) З Бабруйскай і Мазырскай акр.—21 жніўня, а 10 г. раніцы.

в) З Магілеўскай і Аршанскай акр.—22 жніўня, а 10 г. раніцы.

г) З Менскай і Віцебскай акр.—23 жніўня, а 10 г, раніцы.

Да тых т.т., якія ня могуць па якім-небудзь прычынам зьявіцца ў вышэйназначаны час, вызначаецца дадатковы дзень для іспытаў—25 жніўня ў які і належыць зьявіцца ўсім спазьніўшымся на іспыты.

Іспыты будуць праводзіцца ў гор. Менску ў памяшканьні Комвузу Беларусі імя У. І. Леніна (...вэрсытэцкая, 27).

На час іспытаў паступаючыя будуць задаволены інтэрнатам і харчаваньнем.

За сродкамі на праезд у абодва канцы (у Менск і назад) зьвяртацца ў мясцовыя комсамольскія організацыі (Райкомы, Акругкомы), і курсы ў гэтых адносінах абавязкаў на сябе не біруць.

Вытрымаўшыя іспыты будуць кіраваны на месца сваёй працы да атрыманьня паведамленьня аб ... міне пачатку заняткаў на курсах.

Загадчык курсаў Садо...

Адказны рэдактар— Рэдко...

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599